**11 лістапада 2023 г. – 60 гадоў з часу заснавання ўстановы «Занальны дзяржаўны архіў у г. Кобрыне» (1963)**



Архіў у г. Кобрыне быў створаны 11 лістапада 1963 года згодна з пастановай Савета Міністраў БССР «Аб мерах па паляпшэнні архіўнай справы ў БССР» як філіял дзяржаўнага архіва Брэсцкай вобласці ў г. Кобрыне.

Згодна са штатным раскладам на 1964 год у філіяле працавалі ўсяго 4 чалавекі: начальнік філіяла – старшы навуковы супрацоўнік, два інспектары, кур'ер-прыбіральшчык. Філіялу быў выдзелены будынак праваслаўнага сабора Аляксандра Неўскага, у якім з канца 1964 года па кастрычнік 1967 года праводзіўся рамонт будынка. На час рамонту архіў туліўся ў розных часовых памяшканнях: сховішчы займалі адзін пакой будынка гарсавета і адзін пакой знаходзіўся ў паўпадвальным памяшканні Дома культуры.

Па стане на 1 студзеня 1964 года на захоўванні знаходзілася 706 фондаў, 53 097 адзінак захоўвання. У 1965 годзе асаблівая ўвага была нададзена прыёму дакументаў ад сельскіх Саветаў, калгасаў і саўгасаў. Першапачаткова выкарыстанне дакументаў філіяла праводзілася ў асноўным у агітацыйна-прапагандысцкіх і культурна-асветніцкіх мэтах. Пра гэта гавораць назвы фотавыстаў, якія арганізоўваліся да знамянальных і памятных дат: «Избиратели голосуют», «Кобрин за годы Советской власти», «Народные мстители» і інш. Дакументы дзяржархіва выкарыстоўваліся для публікацый артыкулаў у мясцовых СМІ, падрыхтоўкі радыёперадач для раённага радыёвяшчання. Супрацоўнікамі вялася лектарская праца ў калгасах, на прадпрыемствах, у школах.

У кастрычніку 1967 года быў скончаны рамонт будынка, адведзенага пад філіял. Архівасховішча, якое складалася з двух паверхаў (на другім паверсе захоўваліся сакрэтныя дакументы), было абсталявана сістэмай вентыляцыі, сістэмай цэнтральнага ацяплення, якія дазвалялі падтрымліваць пастаянны тэмпературна-вільготнасны рэжым. У 1972 годзе

ўстаноўлена супрацьпажарная сігналізацыя. Акрамя архівасховішчаў меліся два працоўныя кабінеты і адзін агульны працоўны пакой.

На падставе рашэння Кобрынскага гарвыканкама ад 26 лютага 1990 года № 71 будынак сабора Аляксандра Неўскага, у якім знаходзіўся архіў, перададзены рэлігійнаму аб'яднанню праваслаўнага веравызнання. Архіву для размяшчэння быў выдзелены будынак былой пошты па вул. Першамайскай, куды ў маі 1990 года дзяржархіў і пераехаў. У лістападзе 1996 года філіял быў рэарганізаваны ў Занальны дзяржаўны архіў у г. Кобрыне.

4 сакавіка 1998 года адбылося ўрачыстае адкрыццё новага спецыялізаванага будынка па вул. Савецкай, 135 Г, з уводам якога былі створаны ўсе неабходныя ўмовы для захоўвання дакументаў і працы супрацоўнікаў дзяржархіва. Першапачаткова аддзелаў у філіяле не было, паколькі штат быў невялікі. Затым былі створаны тры групы: група ведамасных архіваў і камплектавання; група ўліку, захоўвання і навукова-даведачнага апарата; група выкарыстання дакументальных матэрыялаў. Цяпер у архіве два аддзелы: аддзел справаводства і фарміравання Нацыянальнага архіўнага фонду і аддзел забеспячэння захаванасці, уліку, навукова-даведачнага апарата, выкарыстання і публікацыі дакументаў.

22 мая 2001 года дзяржархіў зарэгістраваны як навукова-метадычная ўстанова «Занальны дзяржаўны архіў у г. Кобрыне». 17 мая 2012 года назва зменена на ўстанову «Занальны дзяржаўны архіў у г. Кобрыне». У зону абслугоўвання дзяржархіва ўваходзяць Бярозаўскі, Кобрынскі, Пружанскі раёны і тэрыторыі ліквідаваных Дзівінскага, Ружанскага, Шэрашаўскага і часткі Антопальскага раёнаў.

У дзяржархіве захоўваюцца дакументы пасляваеннага перыяду, пачынаючы з 1944 года - пастаяннага тэрміну захоўвання і дзве калекцыі дакументаў па асабовым складзе і асабістага паходжання. Усе дакументы знаходзяцца ў адкрытым доступе, грыф «сакрэтна» з дакументаў зняты. Аднак выконваецца інструкцыя аб парадку доступу да архіўных дакументаў, якія змяшчаюць звесткі асабістай тайны грамадзян. Асноўныя функцыі архіва - камплектаванне, захоўванне, улік і выкарыстанне дакументаў Нацыянальнага архіўнага фонду, кантроль за вядзеннем справаводства ў арганізацыях зоны абслугоўвання.

Установа «Занальны дзяржаўны архіў у г. Кобрыне» налічвае 455 фондаў, у якіх змяшчаецца 145 760 адзінак захоўвання. Значную частку дакументаў, якія захоўваюцца ў архіве, складаюць фонды мясцовага кіравання і самакіравання, органаў дзяржаўнага і народнага кантролю, натарыяльных кантор, судоў, пракуратур, органаў планавання і статыстыкі, працы і сацыяльнай абароны насельніцтва, фінансавання і падаткаабкладання, прадпрыемстваў прамысловасці, устаноў адукацыі, культуры, аховы здароўя, прафсаюзных арганізацый і інш. Ёсць справы, якія маюць статус «асабліва каштоўныя». Да іх адносяцца дакументы аб уроне, нанесеным нямецкімі акупантамі ў гады Вялікай Айчыннай вайны; спісы грамадзян, сілком вывезеных у Германію; кнігі ўліку брацкіх магіл і пахаванняў і іншыя дакументы, асабліва запатрабаваныя сёння ў рамках пошукавай працы па генацыдзе.

У архіве г. Кобрына актыўна ўкараняюцца камп'ютарныя тэхналогіі і аўтаматызаваныя інфармацыйныя сістэмы. Паступова асоба каштоўныя дакументы пераносяцца на лічбавы носьбіт. Усё гэта робіцца для забеспячэння надзейнай захаванасці дакументаў для будучых пакаленняў. Ва ўстанове ёсць чытальная зала, абсталяваная ўсім неабходным для наведвальнікаў.

З моманту адкрыцця ў архіве змянілася сем кіраўнікоў. Першым кіраўніком архіва была Соф'я Данілаўна Амельянюк (1963–1965). Затым архівам кіравалі Аляксандр Андрэевіч Машкоў (1965–1979), Нэлі Іосіфаўна Амельянчук (1979–2001), Алена Мікалаеўна Карбунар (2001–2006), Валянціна Станіславаўна Парфянюк (2006–2014), Юлія Уладзіміраўна Вярцейка (2014–2020), Яўгенія Аляксандраўна Хамінчук (2020–2022). Сёння калектыў узначальвае Юлія Уладзіміраўна Закірава.

Матэрыял падрыхтаваны ў 2023 г. Кобрынскай цэнтральнай раённай бібліятэкай. Курачук Святлана Дзмітрыеўна, бібліёграф I катэгорыі аддзела абслугоўвання і інфармацыі

**Зональный государственный архив в г.Кобрине** : путеводитель (1944–2011) /состовители Ю. В. Вертейко, С. Ю. Кузина, В. С. Парфенюк. – Брест : Альтернатива, 2014.

**Установе «Занальны дзяржаўны архіў у г. Кобрыне» (1963) – 60 гадоў** // Зводны Каляндар дат і

падзей Кобрыншчыны : краязнаўча-бібліяграфічны каляндар на 2021–2025 гг. / Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма, цэнтральная раённая бібліятэка, аддзел абслугоўвання і інфармацыі ; склад.: С. Д. Курачук, Л. С. Дардзюк. - Кобрын, 2020. - С. 103.

**Научно-методическое учреждение «Зональный государственный архив в г. Кобрине»** // Фонды и коллекции документов личного происхождения в государственных архивах Республики Беларусь. - Минск, 2009. - С. 110.

**Елизарова, Ж.** «Эпохи память в каждом документе» / Жанна Елизарова ; фото : Жанна Елизарова // Кобрынскі веснік. – 2023. – 7 кастрычніка (№ 62). – С. 6 : фот.

**Елизарова, Ж.** В тишине архива живет история / Жанна Елизарова ; фото: Жанна Елизарова и из архива учреждения «Зональный государственный архив в г. Кобрине» // Кобрынскі веснік. – 2022. - 17 верасня (№ 71). – С. 10 : фот.

**Елизарова, Ж**. Для будущих поколений / Жанна Елизарова // Кобрынскі веснік. – 2022. - 5 кастрычніка (№ 76). – С. 6 : фот.

В государственном архиве в Кобрине содержится 145760 единиц хранения, начиная с 1944 года.

**Мулладжанова, А.** Здесь много папок, документов... / Ангелина Мулладжанова // Кобрынскі веснік. – 2022. - 7 верасня (№ 68). – С. 5 : фот.

История архивной службы Кобринщины.

**Якушик, Т.** Жизнь, посвященная архиву / Татьяна Якушик, Светлана Заруба // Кобрынскі веснік. - 2022. — 11 чэрвеня (№ 43). — С. 12 : фот.

Памяти Елены Николаевны Карбунар - историка, архивиста, человека, посвятившего работе в Зональном государственном архиве Кобрина 37 лет.

**Бакун, Е.** Раскроют тайну архивисты / Елена Бакун // Кобрынскі веснік. – 2021. – 6 кастрычніка (№ 79). – С. 1.

О зональном государственном архиве в г. Кобрине.

**Бакун, Е.** История живет в архивах... / Елена Бакун // Кобрынскі веснік. - 2020. - 3 кастрычніка (№ 77). - С. 4 : фот.

**Козлович, В.** Детектив с архивной папкой / Валентина Козлович ; фото Александра Кулевского // Советская Белоруссия. - 2020. — 19 февраля (№ 33). — С. 8—9 : фот.

О тудовом пути зав. отделом госархива С. Кузиной.

**Свитич, Д.** Сохраняя историю, творим будущее / Диана Свитич // Кобрынскі веснік. - 2020. - 8 лютага (№ 10). - С. 1, 3.

Об истории образования архивной службы Брестской области и работе учреждения «Зональный государственный архив в г. Кобрине».

**Елизарова, Ж.** Лучший архивист Беларуси / Жанна Елизарова // Кобрынскі веснік. - 2018. - 31 кастрычніка. - С. 1, 3.

Зав. отделом госархива в Кобрине С. Кузина — победитель республиканского профессионального конкурса.

**Кузина, С.** На службе у Ее Величества Истории / Светлана Кузина // Кобрин-информ. - 2018. - 4 октября. – С. 2.

Профессиональный праздник отмечают сотрудники Зонального государственного архива в Кобрине.

**Кузина, С. Ю.** Через историю малого раскрывается история страны / Светлана Кузина ; [беседовала] Юлия Вовк // Кобрин-информ. - 2018. — 1 ноября (№ 44). — С. 3.

Беседа с зав. отделом архива в Кобрине С. Кузиной.

**Свитич, Д**. История архива в лицах / Диана Свитич // Кобрынскі веснік. - 2018. — 10 лістапада. — С. 3.

Зональный государственный архив в г. Кобрине отмечает свое 55-летие.

**Бакун, Е**. Здесь хранится история / Елена Бакун // Кобрынскі веснік. - 2017. — 4 кастрычніка. — С. 3.

Кобринский зональный архив обслуживает Кобринский, Пружанский и Березовский районы.

**Кичкайло, А.** Слово о директоре / Ангелина Кичкайло // Кобрин-информ. - 2017. — 5 октября. — С. 3.

О директоре учреждения «Зональный государственный архив в г. Кобрине» Ю. В. Вертеейко.

**Кузина, С.** История в лицах / Светлана Кузина // Кобрин-информ. - 2017. — 5 октября. — С. 3.

**Ефціфеева, Н.** Праз прызму часу да прызоў / Наталля Ефціфеева // Кобрынскі веснік. - 2016. — 29 кастрычніка. — С. 3.

Кабрынчанка С. Заруба - сярод пераможцаў конкурсу «Лепшы архівіст Беларусі».

**Кузина, С.** Бессменный архивохранитель / Светлана Кузина // Кобрин-информ. - 2016. — 6 октября. — С. 3.

О работе Т. М. Якушик, историка-архивиста учреждения «Зональный государственный архив в г. Кобрине».

**Вярцейка, Ю.** «З хваляваннем і гордасцю» / Юлія Вярцейка // Кобрынскі веснік. - 2015.— 2 ліпеня. — С. 2.

Дырэктар занальнага дзяржархіва расказвае пра Дзень незалежнасці, свайго дзеда, удзельніка Вялікай Айчыннай, і пра архіўныя матэрыялы аб вайне.

**Заруба, С.** Архивисты - хранители истории / Светлана Заруба // Кобрынскі веснік. - 2015. — 3 кастрычніка — С. 4.

**Заруба, С.** Архивному делу Брестчины – 75 лет / Светлана Заруба // Кобрынскі веснік. – 2015. – 11 лютага. – С. 5.

Из истории Кобринского государственного архива.

**Кузина, С.** На службе государству, людям и истории / Светлана Кузина // Кобрин-информ. – 2015. – 19 февраля. – С. 7.

О Зональном государственном архиве в г. Кобрине.

**Кузина, С.** Ода руководителям архива / Светлана Кузина // Кобрин-информ. – 2015. - 1 октября. – С. 4.

О руководящих работниках Зонального государственного архива в г. Кобрине.

**Бялоў, Д**. Валянціна Парфянюк: «Прыемна, калі атрымліваецца дапамагчы» / Дзмітрый Бялоў // Кобрынскі веснік. - 2014. - 7 сакавіка - С. 2.

**Кузина, С.** Их профессия – хранить документы / Светлана Кузина // Кобрин-информ. – 2014. – 9 октября. – С. 3.

Зональный государственный архив в г. Кобрине: история, сегодняшний день.

**Кондрашук, Н.** В архивном деле революции не уместны / Наталья Кондрашук // Кобрин-информ. – 2013. – 13 июня (№ 24). – С. 2 : фот.

Делегация руководителей архивных служб и учреждений Беларуси и России посетили Кобрин.

**Лесік, І.** Тут жыццё кіпіць без мітусні / Ірына Лесік // Кобрынскі веснік. – 2013. – 5 кастрычніка. – С. 3 :фат.

**Мельнік, Р.** Кобрынскаму архіву - паўстагоддзя! / Раман Мельнік // Кобрынскі веснік. - 2013.— 23 лістапада. — С. 3.

**Парфенюк, В. С.** За сухими строчками документов - судьбы людей и народа / [Валентина Парфенюк ; беседовала] Наталья Кондрашук // Кобрин-информ. - 2013.—10 октября.— С. 5.

**Борисюк, Ю.** В поисках потерянных документов... : к 90-летию архивной службы Республики Беларусь / материал представлен Юрием Борисюком // Кобрин-информ. - 2012. - 31 мая. - С. 2.

**Сідарук, І.** Адлік захоўвання - 1944 -ты / Ігар Сідарук // Кобрынскі веснік. - 2012. - 6 кастрычніка. - С. 3: фат.

Дакументы пасляваенных гадоў, пачынаючы з 1944 г., захоўваюцца ў занальным дзяржаўным архіве г. Кобрына.

**Парфенюк, В.** История, которую хранит архив / Валентина Парфенюк // Кобрынскі веснік. - 2011. - 3 жніўня. - С. 4.

**Парфенюк, В. С.** «В архиве случайных людей нет» / В. С. Парфенюк ; [беседовала] Светлана Веремеенко // Кобрин-информ. - 2010. - 7 октября. – С. 2.

**Гром, А.** Надёжное хранилище / Анна Гром // Кобрынскі веснік. - 2010. - 6 кастрычніка. - С. 2.

Кобринский архив.

**Парфеннюк, В.** Долг памяти вечен / Валентина Парфеннюк // Кобрынскі веснік. - 2010. - 8 мая. - С. 8.

Зональный государственный архив в г. Кобрине обращается к бывшим воинам Великой Отечественной войны с просьбой передать на государственное хранение документы периода войны.

**Гром, А.** Место, где замедляется время / Анна Гром // Кобрынскі веснік. - 2009. - 24 кастрычніка. - С. 8.

Кобринский архив.

**Белов, Д.** На этих полках - наша история / Дмитрий Белов // Кобрынскі веснік. - 2008. - 16 ліпеня. - С. 4.

Кобринский архив.

**Заглядывая** в прошлое // Кобрынскі веснік. – 2005. – 21 снежня. – С. 2.

Зональный государственный архив в г. Кобрине.

**Пустовой, Е.** Там, где живет история / Е. Пустовой // Кобрин-информ. – 2004. – 7 октября. – С. 2.

О работе кобринского архива.

**Поливода, С.** Архиву сорок лет / С. Поливода // Кобрынскі веснік. – 2003. – 19 лістапада. – С. 3.

Научно-методическое учреждение «Зональный госархив в г. Кобрине».

**Шугай, А.** Усё новае ўжо было ў мінулым / тэкст і фота А. Шугая // Кобрынскі веснік. – 2001. – 22 снежня. – С. 2 :фат.

Занальны дзяржаўны архіў у г. Кобрыне.

**Амельянчук, Н** Архіўнай справе па Брэстчыне – 60 гадоў / Н. Амельянчук // Кобрынскі веснік. – 2000. – 12 лютага (№13). – С. 1.

**Поливода, С.** Хранители прошлого / С. Поливода // Кобрынскі веснік. – 1998. – 14 лістапада (№ 90). – С. 4.

О деятельности кобринского госархива.

**Викторов, В**. Крыша для архивариуса / В. Викторов // Народная газета. – 1998. – 7 красавіка. – С. 9.

Зональный государственный архив в г. Кобрине справил новоселье.

**Хільчук, М**. У архіва – наваселле / М. Хільчук // Кобрынскі веснік. – 1998. – 11 сакавіка. – С. 1.

**Кобринский** архив получил новую прописку // Заря. – 1998. – 10 марта ( № 28). – С. 1 : фот.

Открытие нового здания.

**Шугай, А**. Архівы – справа тонкая / А. Шугай // Кобрынскі веснік. – 1995. – 22 ліпеня (№ 56). – С. 2.

Дзяржаўны архіў ў г. Кобрыне.

**Сідарук, І.** І вера, і гонар, і праца / І. Сідарук // Камуністычная праца. – 1990. – 12 мая.

Архіў пакідае храм святого Ал. Неўскага, пабудаванага ў 1868 г.

**Палівода, С.** Без архіва няма гісторыі / С. Палівода // Зара камунізму (Пружаны). – 1988. – 7 чэрвеня.

Аб дзейнасці філіяла дзяржархіва Брэсцкай вобласці ў г. Кобрыне.

**Палівода, С.** Філіялу дзяржархіва – 20 гадоў / С. Палівода // Камуністычная праца. – 1983. – 12 лістапада.

**Машкоў, М.** Нашы архівы – на службу на роду аб стварэнні ў г. Кобрыне філіяла дзяржархіва Брэсцкай вобласці / М. Машкоў // Камуністычная праца. – 1967. – 8 красавіка.

Аб стварэнні ў г. Кобрыне філіяла дзяржархіва Брэсцкай вобласці.

Кобрын
Занальны дзяржаўны архіў у г. Кобрыне
Архівы